**УДК 821.161.3-31*Л.Дайнека**

*А. В. Канаваленка*

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ СТРУКТУРА РАМАНА Л. ДАЙНЕКІ «ТОЙ, КАГО ЎДАРЫЛІ ПА ШЧАЦЭ»

*У артыкуле на прыкладзе рамана Л. Дайнекі «Той, каго ўдарылі па шчацэ» разглядаюцца асаблівасці арганізацыі хранатопу буйнога мастацкага тэксту. Прасторава-часавая структура рамана грунтуецца на біяграфічным, авантурным і ідылічным хранатопах. Робіцца выснова пра сумяшчэнне ў тэксце так званага «бытавога» і «інтымнага» часу. Для больш выразнага адлюстравання эпохі пісьменнік выкарыстоўвае феномен двайніцтва і дэманструе арыгінальныя падыходы да арганізацыі хранатопу кахання.*

Час і прастора складаюць аснову кожнага мастацкага твора. Яны аб’ядноўваюць тэкст у адзінае цэлае, ствараючы своеасаблівы хранатоп. У літаратуру гэты тэрмін упершыню ўвёў М. Бахцін, які адзначаў выключнае значэнне згаданых фармальна-змястоўных катэгорый. «Можна прама сказаць, што жанр і жанравыя разнавіднасці вызначаюцца менавіта хранатопам, прычым у літаратуры вядучым пачаткам у ім выступае час» [1, с. 235], – піша літаратуразнаўца ў сваёй навуковай працы «Формы часу і хранатоп у рамане». Па меркаванні Р. Слепухава, «прастора і час, выступаючы ў якасці структурных элементаў твора, выконваюць задачы, што далёка выходзяць за рамкі структураўтварэння: спрыяюць тыпізацыі, узбуйненню пэўных бакоў рэчаіснасці, якая адлюстроўваецца, узмацненню эстэтычнага ўздзеяння твора, факусоўцы ўвагі на галоўнай ідэі, адлюстраванню этычных бакоў мастацкага вобраза мовай прасторава-часавых сімвалаў» [2, с. 65]. Хранатопы дапамагаюць вызначыць кампазіцыю, даць вобразна-сэнсавую характарыстыку і зразумець заканамернасці ўтварэння сюжэта мастацкага твора. Катэгорыі прасторы і часу маюць вялікае выяўленчае значэнне, паколькі дзякуючы адпаведным хранатопам сюжэтныя падзеі канкрэтызуюцца і набываюць пачуццёва-вобразны характар.

Адзін з апошніх раманаў Леаніда Дайнекі «Той, каго ўдарылі па шчацэ» прысвечаны Язафату Кунцэвічу, царкоўнаму і грамадскаму дзеячу Вялікага Княства Літоўскага. Пісьменнік адзначае, што раман стварaўся дзеля «рэабілітацыі вуніяцкага арцыбіскупа Полацкага і Віцебскага» [3, с. 47]. Катэгорыя часу ў рамане характарызуецца наяўнасцю межаў – як размытых (на працягу адной эпохі), так і дакладных: «Да ад’езду ў Вільню заставалася тры дні» [3, с. 104]; «Гэта адбылося 21 верасня 1452 года» [3, с. 47].

Умоўна раман падзяляецца на дзве часткі. Дзеянне першай адбываецца ў Італіі XV стагоддзя. Галоўным героем тут выступае Джыралама Саванарола, манах і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

рэфарматар. Яго бацька марыць аб медыцынскай кар’еры сына, аднак з юнацкіх гадоў хлопчык цягнецца да ведаў і рэлігіі. Акаляючая рэчаіснасць абурае Джыраламу Саванаролу, бо вакол пануюць культ забаў, ежы і пітва, а людзі забываюцца на мараль: «Пыхлівая Фларэнцыя, якая амаль задыхалася ад сваіх велізарных багаццяў, уяўлялася яму старой ведзьмай, што з вар’яцкім смехам адганяе кожнага галоднага, хто асмеліцца папрасіць у яе кавалачак хлеба. А бясконцыя балявані накочваліся на гэты ненасытны горад» [3, с. 55].

Ледзьве не двайнікам Джыраламы Саванаролы з’яўляецца галоўная дзеючая асоба другой умоўнай часткі – Язафат Кунцэвіч. Хлопчык нараджаецца ў XVI стагоддзі ў сям’і цэхмістра Гаўрылы. Вастраканцовы шавецкі нож бацька «ўклаў у малюсенькую ручку свайму сынку, як толькі пабачыў» [3, с. 16]. Цэхмістар Гаўрыла ўпэўнены, што нашчадак абавязкова абярэ бацькаву сцяжыну, аднак хлопец становіцца паслядоўнікам Джыраламы Саванаролы і абірае шлях святара. Безагляднае захапленне рэлігіяй паступова прыводзіць Язафата Кунцэвіча да лёсу свайго былога куміра: абодва паміраюць у пакутах.

Апісанні жыцця гэтых герояў ахоплівае перыяд ад іх нараджэння і да самай смерці. Характары рэлігійных дзеячаў на пачатку твора ў поўнай меры не раскрытыя. З развіццём падзей становіцца відавочным, што персанажы ў рамане статычныя. Гэта значыць, што акаляючая рэчаіснасць не ўплывае на ўчынкі героя, мяняючы яго характар у станоўчы ці адмоўны бок, а толькі робіць першапачатковыя рысы больш выразнымі з цягам часу. Дадзенае сцвярджэнне гаворыць на карысць біяграфічнага хранатопу як асноўнай мастацкай стратэгіі аўтара. Так, упарты і непрымірымы характар Язафата Кунцэвіча праяўляецца яшчэ ў маленстве. Спачатку будучы святар да крыві б’е чалавека па галаве за абразу свайго бацькі. Затым не можа дараваць свайму сябру занадта моцны ўдар па шчацэ падчас інсцэніроўкі аднаго з эпізодаў Святога Пісання. І, нарэшце, гвалтоўна насаджае ўніяцкую веру ў грамадстве, будучы ў сталым узросце.

Да біяграфічнага далучаюцца рысы авантурнага і ідылічнага хранатопаў. Авантурная часапрастора акрэсліваецца праз пераважную хуткасць дзеяння, адсутнасць выразных паказчыкаў змены прыродных цыклаў: сезонаў альбо сутачнага часу. Арганізуючую ролю тут адыгрывае выпрабаванне герояў на вернасць. У першую чаргу гэта датычыцца адносінаў паміж закаханымі. Так, раскол у сям’і Горніч пачынаецца з нечаканай цыдулкі, што пакінуў для маладой Раіны Горніч шляхціц Антон Браткоўскі. Дзяўчына па незразумелай нават для сябе прычыне хавае ліст і не гаворыць мужу ні слова. У сваю чаргу, Станіслаў Горніч звяртае ўвагу на іншую кабету – прыгажуню Янку Хрысціянку, з якой іх сям’я пазнаёмілася выпадкова. Гісторыя некалі шчаслівых Горнічаў заканчваецца трагічна: Раіна і Антон Браткоўскі паміраюць, падобна да сярэднявечных Трышчана з Іжотаю, а свабодалюбная Янка Хрысціянка адштурхоўвае ад сябе хлопца, і Станіслаў Горніч застаецца адзін. Ён разважае, што «шлюб – гэта святая повязь і ўвасабленне вечнага саюза, што заключаецца паміж Богам і падданымі Ягонай Царквы» [3, с. 187]. Парушыўшы дадзеныя адно аднаму абяцанні ў вечным каханні, героі ўгнявілі Бога і расплаціліся за свае памылкі. Такім чынам, жыццё чалавека ў рамане «Той, каго ўдарылі па шчацэ» не абыходзіцца без «гульні лёсу», а таксама ўмяшання ірацыянальных сіл і Бога, іншымі словамі, падпарадкавана ідэі правідэнцыялізму, што чарговы раз пацвярджае наяўнасць авантурнага хранатопу.

У свеце, створаным Леанідам Дайнекам у рамане «Той, каго ўдарылі па шчацэ», каханне ўяўляецца як стан зменненай свядомасці, накшталт алкагольнага ап’янення. Пасля пацалункаў, абдымкаў ці сустрэчы з дарагім чалавекам герояў ахоплівае вар’яцтва, эйфарыя, паляпшаецца настрой, ствараецца ілюзія лёгкасці: «Якая да д’ябла хімія, калі сэрца ператварылася ў паднябесную крылатую птушку і лётае высока-высока, недзе побач з Сонцам» [3, с. 60]; «Ён адкінуў убок шаблю, падхапіў Раіну на рукі <…>. Ён нібы сшалеў» [3, с. 197]. Разам з тым можна казаць пра наяўнасць у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

хранатопе выпадкаў, якія часова выключаюць чалавека з падзей, пераносяць яго ў іншае вымярэнне. Так, пасля вяртання дачкі мясцовага бурмістра Раіны са спаткання яе думкі амаль цалкам запоўніў вобраз Станіслава Горніча. Дзяўчына нават злавалася на бацьку, што дазваляў бачыцца з каханым толькі пры адной умове: жарэбіцкі шляхціц павінен перайсці з каталіцкага веравызнання ва ўсходнюю грэцкую царкву. Але Раіна, «робячы выгляд пакорлівай дачкі, што вельмі ўважліва слухае свайго бацьку і згодна хітае галавой, амаль не чула яго» [3, с. 63]. У такім стане пачуцці і паводзіны герояў выходзяць па-за межы нормаў тагачаснай маралі, прадузятасцяў ці прымхаў грамадства. Закаханыя імкнуцца да пераасэнсавання негатыўных сітуацый, становяцца моцнымі псіхалагічна і фізічна. У авантурным хранатопе мужчыны пераўвасабляюцца ў сапраўдных рыцараў, здольных «кахаць і кахаць, складваць да чароўных ножак заваяваныя ў бітвах трафеі, ахоўваць гонар і радасць самай вялебнай Дамы» [3, с. 60], а жанчыны нагадваюць пяшчотных амазонак, у натуры якіх сумяшчаецца і ваярскі дух, і клопат пра блізкіх людзей.

Акрамя гэтага ў творы малюецца і адваротны бок салодкага для душы пачуцця, поўны жалю і незадаволенасці. Каханне, што не знаходзіць адказу, выклікае апантанасць і поўнае растварэнне ў іншым чалавеку – той спектр пачуццяў, які старажытныя грэкі называлі «mania». Часам героі пакутуюць ад немагчымасці быць разам з аб’ектамі свайго захаплення, што спараджае дэпрэсію і роспач: «Некуды ішоў, нешта піў і еў, з некім размаўляў, клаўся спаць, затым прачынаўся. Такое меланхалічнае яго існаванне заўважылі родзічы» [3, с. 49]. Свет, які імгненне таму быў яркім і прывабным, пачынае малявацца шэрымі фарбамі. У ім людзі не ўсхваляюць любоў, а «ўздымаюць на п’едэстал гнюсную распусту, мярзотнае савакупленне, дзікія паганскія насалоды» [3, с. 124].

Прастора, у якой закаханыя персанажы маюць зносіны адзін з адным, непарыўна звязана з адчуваннем «асабістай тэрыторыі». Час, што адводзіцца для перамоў ці вырашэння пэўных бытавых пытанняў, сумяшчаецца у творы з часам «інтымным». На інстынктыўным узроўні гэтыя «ўласныя» межы старанна абараняюцца героямі. У іх дапускаюцца каханыя, блізкія сябры ці члены сям’і. Але варта іншым патрапіць у такія «інтымныя межы», як героі выяўляюць агрэсіўнасць ці адчуваюць разгубленасць, сарамлівасць. Так адбылося, калі замест Раіны на спатканне са шляхціцам Станіславам прыйшла «нейкая шчуплаватая някідкая з выгляду дзеўчынёха» [3, с. 59]. Яна гуляла над рэчкаю і нервова адшчыквала пялёсткі лугавых кветак. Такая неспадзяванка – сустрэць іншую кабету ў месцы, куды павінна прыйсці каханая – на хвіліну збянтэжыла паніча, і ён нават «сам здзівіўся сваёй разгубленасці і стану маўклівасці» [3, с. 59]. Выявіць узровень псіхалагічнай і эмацыйнай блізкасці ў рамане дапамагаюць назіранні за адлегласцю, на якой трымаюцца героі. Да прыкладу, калі ў карэце едуць закаханыя, «прытуліўшыся плячамі, цесным замком сашчапіўны рукі» [3, с. 102], то паміж іншымі персанажамі такога выразнага абазначэння межаў, на якіх трымаюцца героі, няма: яны размаўляюць на адлегласці, не дакранаючыся адзін да аднаго.

Ідылічны хранатоп традыцыйна ў Л. Дайнекі выяўляецца шляхам параўнання адносінаў герояў да «чужых» земляў і роднага кутка. Так, жыццё ў лясным маёнтку Жарэбычы Станіславу Горнічу здаецца нешчаслівым, небяспечным і абмежаваным. Затое радзіма для яго – лепшае, што можа быць у свеце: «Абрыдла гэтая Валынь, дзе паўсюль палякі, дзе рукой падаць да Стэпу з ягонымі ненасытнымі казакамі і татарамі. <…> Станіслаў Горніч, назаўсёды перабярэцца на сваю радзіму – у Вялікае Княства Літоўскае, у Ліцвінію. Там усё лепшае – і паветра, і зямля, і людзі» [3, с. 188].

Такім чынам, узаемасувязь часу і прасторы ў мастацкім тэксце выяўляецца праз шэраг асаблівых аспектаў. У рамане «Той, каго ўдарылі па шчацэ» назіраецца дамінаванне біяграфічнага, авантурнага і ідылічнага хранатопаў. Тут прасочваецца сувязь чалавека з месцам, дзе ён нарадзіўся, а жыццё асобы адкрыта для ўсяго

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грамадства: яно падлягае ўсеагульнаму кантролю і ўліку, прычым знешнія абставіны і падзеі толькі дапаўняюць характар героя, сведчыць пра яго статычнасць. Каханне ў творы Л. Дайнекі нагадвае стан алкагольнага ап’янення, а «бытавы» час суіснуе з «інтымным», «асабістым». Важнае значэнне ў прасторава-часавай арганізацыі рамана адведзена супадзенням, выпадку і чарадзе нечаканасцяў.

**Літаратура**

1 Бахтин, М. Формы времени и хронотопа в романе. Очерки по исторической по- этике / М. Бахтин // Вопросы литературы и эстетики. – М. : Художественная литерату- ра, 1975. – С. 234–407.

2 Слепухов, Г. Н. Пространственно-временная организация художественного произведения / Г. Н. Слепухов // Философские науки. – 1984. – № 1. – С. 64–70.

3 Дайнека, Л. Той, каго ўдарылі па шчацэ [Электронны рэсурс] / Л. Дайнека. – Электронная кнігарня. – Мінск, 2016. – Рэжым доступу: https://kniharnia.by/catalog/gistarychnaya_proza/toy_kago_daryli_pa_shchatse. – Дата доступа: 19.05.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ